**Карпаў М.М.,** студ. 214 гр.
Навуковы кіраўнік – Катовіч А.В.

# ЖЫВЫ АГОНЬ Ў КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Чалавеку здаўна вядоты такія касмічныя стыхіі, як зямля, вада, агонь і паветра. З міфалагічных часоў зямля сімвалізавала урадлівасць, плоднасць, яе ўвасаблялі, як жанчыну-маці. Вада, якая магла быць «жывой» і «мёртвай» увасаблялася людзям, як жыццё і смерць. Агонь, як сімвал далучанасці да нябеснай сферы лічылі «жывым». Зпрадвеку кожную з гэтых стыхій чалавек паважаў і ўшаноўваў.

Раней пра агонь гаварылі: «Агонь Бог даў людзям, як выгнаў іх з раю, каб яны, гледзячы на агонь, успаміналі Бога, каб яны любілі агонь і баяліся яго, бо агонь, калі добра, то добра, а кілі не, то дасца ў знак. Як Бог выгнаў першага чалавека з раю, то чалавек пачаў дрыжаць ад холаду. От Бог вялеў яму ўзяць два кускі моцнага дзерава і церці іх. Як чалавек паслухаў Бога і тое зрабіў, то дзерава і загарэлася і сагрэла чалавека. Паглядзеў чорт, як чалавек грэецца, украў у яго трохі на ожагу агню, да як упёк стос лому, дак агонь шыбануў роўна з лесам. От чорт, каб пагрэцца, як скочыў у вагонь, дак на ём уся шэрсць паскверылася, а сам ён абгарэў, бы галавешка. От затым ён такі чорны, што аж блішчыць, толькі зубы да бялкі белыя. Пабачыў чорт, што агонь пячэцца, да й занёс яго ў пекла, каб там агнём мучыць грэшныя душы. Ад тых часоў служыць людзям і ліхім. Агонь нам свеціць, грэе, дае цяпло, але ён і служыць ліхому і можа нарабіць нам шмат ліха» [2, с. 45].

У беларусаў лічылася, што ўдары маланкі і грому апладнялі зямлю для нараджэння новага ўраджаю. Таксама праз спрэчку Бога і чорта апісвалі навальніцу: «Навальніца адбываецца таму, што чорт асмельваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спрачацца з Богам: «Ты мяне не заб'еш, я схаваюся!» – «Не, не схаваісся!» – «Я ў чалавека залезу, а ўсё ж схаваюся!» – «Я й чалавека ўб'ю, гразоў яму за ета адпушчу, а цябе ўсё-тыкі дастану!..» Таму ў час навальніцы трэба, па магчымасці, сядзець дома, хрысціцца і маліцца. Вельмі карысна запальваць лампаду ці свечку перад абразамі. Есці ў час навальніцы ці працаваць, Божа барыні, нельга» [2, с. 65].

Так, ва ўяўленнях і павер'ях усходніх славян Агонь – даволі грозная стыхія, якая засцерагае ад нячыстай сілы і бароніць ад хваробы і смерці. У. І. Коваль у сваёй кнізе «Народныя ўяўленні, павер'і і прыметы» пісаў: «Богам агню ў старажытных славян-язычнікаў з'яўляўся Пярун, ролю якога пасля прыняцця хрысціянства стаў выконваць свят прарок Ілля.

На думку некаторых этнографаў і міфолагаў, агонь увасабляе мужчынскі, а вада – жаночы пачатак; у абрадах і розных рытуальных дзеяннях мужчыны і хлопцы звычайна знаходзяцца каля вогнішча, а жанчыны і дзяўчаты – каля вады. Па народных павер'ях, бліжэй за ўсіх да стыхіі агню знаходзяцца кавалі, якія з-за гэтага з'яўляюцца недасягальнымі для нячыстай сілы; менавіта таму сава («чортава птушка») не можа садзіцца на дом, дзе жыве каваль» [7, с. 13].

У беларускіх абрадах і рытуалах людзі даволі часта выкарыстоўвалі агонь. Самы знаёмы прыклад ужывання агню ў каляндарных абрадах – гэта купальскія кастры: «Асаблівай ачышчальнай сілай надзяляліся купальскія вогнішчы: скаканне праз іх дзеля ачышчэння ад хвароб і абароны ад нячысцікаў лічылася абавязковым элементам купальскай абраднасці . Праз купальскі агонь праганялі таксама жывёлу для абароны яе ад магчымых эпідэмій. Жанчыны спальвалі ў гэтых вогнішчах знятыя з хворых дзяцей сарочкі, каб разам з бялізнай згарэлі і хваробы» [7, с. 13–14]. Папараць-кветка ў беларусаў лічылася сімвалам «паміраючага» сонца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Таксама вельмі знаёмы ўсім рытуал спальвання саламянага пудзіла на Масленіцу. «У адных мясцінах Беларусі сімвалам заканчэння зімы было спальванне саламянага чучала дзеда або бабы, у іншых – там, дзе адсутнічала ігрышча «Дзед касцёю падавіўся», «Баба сырніца падавілася» – у апошні дзень свята рабілі саламянае чучала Масленіцы, або Масленіка. Пад вечар чучала ўмацоўвалі на санях, правозілі па ўсёй вёсцы, а затым вывозілі на пагорак, на ўзвышша і спальвалі на захадзе сонца на спецыяльна падрыхтаваным вогнішчы» [3, с. 126].

Даволі распаўсюджанай была традыцыя, калі прадстаўнікі кожнай вясковай сям'і прыносілі і спальвалі ў маслінічным вогнішчы якую-небудзь старызну: паламаны кош, сапсаваную барану, лапці-істопкі і г.д. Гэтым самым людзі ачышчалі падворак, вуліцу, усе збудаванні і рыхтавалі сваю асвоеную прастору да веснавога абуджэння і абнаўлення.

Наступны даволі яскравы прыклад – свята Грамніцамі, якое святкуецца 15 лютага. Кожны гаспадар да гэтага дня павінен быў зрабіць сваю грамнічную свечку: «У гэтым не дужа складаным і не такім ужо адказным, як можа падацца на першы погляд, перадсвяточным дзеянні на самой справе была закладзена класічная для традыцыйнай культуры ідэя самазахавання». [4, с. 95]. Грамнічная свечка лічылася заступніцай усёй сям'і. Яе даставалі з месца пастаяннага захавання з рознай нагоды: запальвалі тады, калі засыпалі насеннае зерне у мяшкі перад сяўбой і пры засыпанні ў засек першага вымалачанага снапа, каб захаваць палетак ад граду; без грамнічнай свечкі ні адна гаспадыня не распачынала жніво; каб перакрыць дарогу ведзьмам і ведзьмакам, гаспадыня вешала грамнічную свечку кнотам уніз да дзвярнога касяка 6 мая, на Юр'я, каб завахаць карову-карміцельку.

На магілёўшчыне і гомільшчыне даволі распаўсюджаны абрад «Свяча»: «Аброчная свечка ўяўляе сабой невялікі скульптурны помнік з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

воску. Яе таўшчыня – не менш за пятнаццаць сантыметраў, вышыня – да сарака. Свечку ставілі ў ступу , якую ставілі ў вечка дзяжы, «апраналі» у спецыяльна пашытае «плацце», зверху павязвалі невялічкія фартушкі, упрыгожаныя пацеркамі, стужкамі, вышыўкай. Кожны год упрыгажэнні абнаўлялі, таму з цягам часу свечка станавілася ўсё больш тоўстай. Акрамя таго на ёй мацавалі маленькія свечкі, з якімі людзі прыходзілі на малебен, воск плавіўся і абцякаў, ад гэтага свечка станавілася яшчэ больш цяжкай» [3, с. 326–327]. Для людзей гэтая свяча была чымсьці цудоўным і сакральным. Нават пра святочны стал гаварылі: «Чокаліся за сталом, таму што «свяча» жывая».

«Жывы» агонь быў самым актыўным «удзельнікам» у сямейна-родавых абрадах. Так, адпраўляючы маладых да храма нехта з удзельнікаў провадаў запальваў у варотах куль саломы: «Каб маладых не зачаравалі ў дарозе, як яны едуць да вянца, то яшчэ як толькі яны выязджаюць з двара, то ў вароцях кладуць салому і запальваюць яе да й пераязджаюць той агонь. Тым яны ўжэ гартуюцца і не баяцца ніякіх чараў. А заўжды знойдуцца такія ліхія людзі, што наробяць усялякіх псотаў. Больш усяго яны там, дзе вельмі глыбокія каляіны, кладуць у іх дзяркач. От, калі маладыя, не пераязджаючы цераз агонь, да ўз'едуць  на дзяркач, то ўсё, што ўдзеена, пэўна збудзецца» [8, с. 352].

Агнём свечкі, часцей за ўсё грамнічнай, бабка-павітуха абносіла парадзіху і нованароджанага, а таксама калі бацькі адпраўлялі хросных і дзіця ў храм да святога хрышчэння. Каб аблегчыць перадсмяротны час у рукі паміраючага ўкладвалі таксама грамнічную свечку і сачылі каб увесь час пакуль ў хаце ляжыць нябожчык, гарэла свечка, агаркі якіх потым заносілі у царкву. Жалобны стол пачынаўся з таго, што запальвалі свячу.

Акрамя карыстання агнём у каляндарных святах і сямейна-родавх абрадах агонь саграваў печ, якая была ў кожнаў сялянскай хаце. Агонь у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

печы ўспрымаўся як зямны эквівалент нябеснага свяціла, назва якога ў беларускай народнай лексіцы нярэдка гучала як «слонца», таму і прыстасаванне для таго, каб зачыніць печ на ноч ці днём, называлі заслонка або засланка. У печы агонь тушылі толькі ў выключных выпадках: калі хтосьці ў хаце паміраў; падчас эпідэміі або мору хатняй жывёлы; у такія вялікія гадавыя святы, як Каляды, Вялікдзень, Купалле, Багач.

Значная колькасць рытуальных дзеянняў выконваліся пры непасрэдным дачыненні печы. Так, вяртаючыся з могілак пасля пахавання, родныя і блізкія памерлага збіраліся на памінальную вячэру, але перш чым сесці за стол, усе прысутныя павінны былі «пагрэць рукі», гэта значыць па чарзе падысці да печкі і аберуч дакрануцца да яе, а таксама зазірнуць у печ, каб пазбавіцца ад тугі па нябожчыку і страху перад ім, «каб смерць праз комін пайшла».

Захаванне агню ў печы сімвалізавала прадаўжэнне роду, жыцця. Былі таксама і розныя табу звязаныя з агнём. Абавязкова, калі ў хаце паміраў чалавек, агонь у печы тушылі. Нельга было паліць агонь у печы на Благавешчанне і ў першыя тры дні велікоднага тыдня. Забаранялася пляваць на агонь, заліваць яго вадой. Аддаць агонь са сваё хаты – лічылася, аддаць дабрабыт і шчасце дамачадцаў. Таксама нельга было купляць або асвячаць грамнічныя свечкі для іншых, а таксама пазычаць іх.

Такім чынам агонь, як і астатнія стыхіі іграў у жыцці чалавека вялікую ролю. Агонь на працягу гісторыі дапамагаў чалавеку, аднак гэта вельмі небяспечная стыхія і з ёй трэба абыходзіцца з асцярожнасцю. Але сёння ўжо не магчыма ўявіць сабе такія галоўныя святы нашай краіны, як Дзень Незалежнасці, або 9 Мая без выкарыстання салюта і фейерверкаў, гародскога святкавання Масленіцы і Купалля без вялікага вогнішча. Апошнія гады набывае моц так званыя фаер-шоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На мой погляд, агонь – вельмі важная рэч ва мностве беларускіх свят і ён, як сімвал сонца, сімвал далучанасці да нябеснай сферы мае вялікае права на адраджэнне, захоўванне і ўшанаванне.

1. БНТ: Легенды і паданні / склад. М.Я. Грынблат, І.І. Гурскі; рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.

2. Зямля стаіць пасярод свету : беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Кн. 1. – Мінск : Маст. Літ., 2010. – 574 с.

3. Катовіч, А. В. Веснавыя святы : у 2 кн. / А.В. Катовіч, І.І. Крук. – Кн. 1. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 359 с.

4. Катовіч, А.В. Зімовыя святы / А.В. Катовіч, І.І. Крук. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 119 с.

5. Катовіч, А.В. Летнія святы : у 2 кн. / А.В. Катовіч, І.І. Крук. – Кн. 1. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – 368 с.

6. Катовіч,А.В. Мікольская «Свяча» / А.В. Катовіч, І.І. Крук. – Мінск. – 2013. – 93 с.

7. Коваль, У.І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыметы: даведнік па усходнеславянскай міфалогіі / У.І. Коваль – Гомель : Беларускае агенства навук.-техн. і дзелавой інфармацыі, 1995. – 180 с.

8. Котович, О.В. Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О.В. Котович, И.И. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 847 с.

9. Котовіч, О.В. Золотые правила народной культуры : / О.В. Котович, Я. Крук. – 6-е изд. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2011. – 592 с.

10. Ненадавец, А.М. Святло таямнічага вогнішча / А.М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь. – 1993, – 287 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Толстая, С.М. Полесский народный календарь / С.М. Толстая. – М. : Индрик, 2000. – 600 с.

**Качан М.С.,** студ. 414 гр.
Научный руководитель – Сулима А.Н.

## ОСОБЕННОСТИ ОРГАНИЗАЦИИ ОФИЦИАЛЬНЫХ ПРИЕМОВ И ИХ ХУДОЖЕСТВЕННОЕ ВОПЛОЩЕНИЕ

Современное политическое положение не только в нашей стране, но и во всем мире, побуждает общество, политических деятелей и глав государств активно налаживать дружеские отношения с лидерами других стран. Одним из популярнейших способов проведения дипломатической беседы или же встречи политических лидеров является – прием. Данный вид встречи использовался и продолжает активно использоваться всеми главами государств, независимо от идеалистических, религиозных и политических взглядов.

Приём – собрание приглашённых у какого-либо лица, или форма организации рабочих встреч, позволяющая обсуждать в непринуждённой обстановке темы, которые по целому ряду обстоятельств нежелательно затрагивать на официальном уровне. Приёмами также нередко называют официальные собрания в честь какого-либо лица или события. Таким образом, официальным называется такой прием, на который присутствующие приглашены исключительно в силу их общественного положения. Во время приемов важную роль играют закуски и дегустация напитков, а получение нужной информации происходит в неофициальной обстановке и непринужденной форме. Благодаря взаимному обмену

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ